

# Буяльская Светлана Анатольевна

*Главный специалист по защите государственных секретов*

# Моя Беларусь

Все дороги, леса, перелески,
Все родная моя Беларусь.
Красотой я любуюсь небесной,
Утончаю изысканный вкус.

Переменчивый климат весенний,
Снега в Минске ну как в феврале.
Ну а в Бресте полно искушений
Искупаться в весеннем тепле!

И изнеженный воздух с прохладой,
Переливы атласных озер.
Для души и для сердца услада,
И лесов необъятный простор.

Мягкий говор певучий полесский,
Розоватый, как сказка, рассвет.
И от Минска до самого Бреста,
Беларусь — мест красивее нет!

Мне в окно улыбается солнышко,
Будит ласковым, нежным лучом.
Рада каждой рассветной я зорюшке,
Машет аист мне белым крылом!

Светлана Буяльская

04.04.2023

# Любимой статистике

Когда-нибудь я посвящал, конечно, оду,
Тебе, статистика любимая моя.
И в ясный день, в любую непогоду,
Спешу к тебе, ведь здесь моя семья!

Прекрасный коллектив, простые люди,
Отдел любимый, женский наш цветник.
Среди диаграмм и точных цифр черствее мы не будем,
Ведь мир статистики прекрасен и велик!

Сто лет статистике – значительная дата!
Здесь столько судеб, выдающихся людей!
И мир без информации не будет,
Всегда он в курсе цифр и новостей!

И благодарна я судьбе, прекрасным людям,
За ценный опыт, за поддержку и тепло.
И пусть в статистику всё лучшее пребудет,
Я точно знаю, с ней мне в жизни повезло!

Светлана Буяльская
22.08.2020




# Афанасьев
# Илья
# Всеволодович

*Главный специалист*
*Отдела региональной статистики*

Мерцает в темноте тусклый монитор,
За окном течет поток машин и людей.
На улице утро, еле светло,
И так на протяжении долгих дней.

Ты службу несешь, пока другие еще спят,
Не жалея ни нервов своих, ни сил.
Знай - неважно, что другие о тебе говорят,
Ведь ты только верой и правдой служил.

Ты - серый кардинал современного мира,
Цифры и перо твое ремесло.
В твоих руках сосредоточена великая сила,
Жаль никто не оценит твое мастерство.

В твоем мире не существует отдельных явлений,
Ты смотришь на картину всю целиком,
Изучая, как меняется жизнь поколений,
Следишь, чтобы все шло своим чередом.

Ты мог бы одним легким движением,
Кого-то низвергнуть, а других вознести,
Но не пользуешься ты своим положением,
Непозволительно это для Правды слуги.

Ты - невоспетый герой современного мира,
Цифры и перо твое ремесло.
В твоих руках сосредоточены знания мира,
Жаль никто здесь не ценит твое мастерство.



Апанасевич
Юлия
Николаевна

*Специалист по проведению обследований*
*Отдела статистики Солигорского района*

# РОДНЫ КУТ

Люблю я родныя мясціны
За шыр лугоў, за далеч неба,
За чырвань спелае рабіны,
За спеў шпакоў, за водар хлеба.

За сінь азёр, за смак маліны,
За сілу велічных дубоў,
Саспелых яблыкаў налівы,
За крык у небе жураўлёў.

Люблю зімовыя забавы,
На Новы год калядаваць,
Лясоў зялёныя дубровы,
На полі жытнім сенажаць.

Блішчыць пшаніца пазалотай,
Калыша вецер каласкі,
Вярба схіліла бестурботна
Свае галінкі ля ракі.

І прыгажэй няма нічога
Лугоў з блакітных васількоў,
Дзе стужкай сцелецца дарога
У родны кут, у дом бацькоў.

Апанасевіч Юлія

# МОВА РОДНАГА КРАЮ

Мовы розныя ёсць на зямлі,
Але ўсё ж даражэй не бывае
Мовы той, на якой мы раслі,
Мовы нашага роднага краю.

З даўніх часоў услаўлялі паэты
Яе ў творах, у вершах ды казках,
Каб данесла яна ўсяму свету
Прыгажосць, мелагучнасць ды ласку.

Як на мове прыгожа гучаць
Словы розныя: мара, натхненне,
Быццам хочацца іх заспяваць-
Наваколле, каханне, сумленне.

Кропкі-зорачкі ярка заззялі
У блакіце высокіх нябёс,
З вышыні быццам мне прадказалі
Які будзе ў жыцці маім лёс.

Заблішчыць над ракой навальніца,
І вясёлка раскінецца там,
Хочу я да зямлі пакланіцца
І сказаць сваім родным бацькам:

- Мне замежныя мовы не трэба,
Беларускую мову люблю,
Даражу, як скарыначкай хлеба,
Паважаю, як маці-зямлю.

Усё мне люба ў маёй Беларусі:
Спеў шпакоў, у палях васількі,
Я краінай сваёй ганаруся,
Мовай звязаны мы, земляккі.

**Апанасевіч Юлія**

# МАТУЛІН ЗАПАВЕТ

Любіце бацькаўшчыну, дзеці,
Дзе б ні былі, любіце,
Яна радней за ўсё на свеце,
Вы змалку беражыце

Усе каштоўнасці зямлі-
Старонкі беларускай,
Дзе нарадзіліся, раслі
І сцежачкаю вузкай

Хадзілі ў школу, каб пазнаць
Усе азы навукі.
Мінуць гады- іх вывучаць
Ужо будуць вашы ўнукі.

Не страціце тое, што ад продкаў
Вам засталося ў спадчыну-
Любіце родную старонку,
Шануйце мову матчыну.

Вы, як малітву, запавет
Мой у сэрцы беражыце:
Які б ні быў увесь белы свет-
Па-божаму жывіце.

Ад вас нашчадкам застанецца
Няхай мая парада:
Любіце бацькаўшчыну, дзеці,
І ў Бога верце свята.

**Апанасевіч Юлія**

# БАЦЬКОЎСКІ ДОМ

Мне дом бацькоўскі часта сніцца,
У гэтым сне маё дзяцінства,
Там рэчка, лес, лугі – свабода,
Мне кут мой дорыць асалоду.

Не трэба мне ні Крым, ні Сочы,
Ні пляж турэцкіх берагоў,
У Егіпет я ніяк не хочу,
Паеду ў вёску да бацькоў.

Туды, дзе б'юць ключом крыніцы,
Дзе гай бярозавы шуміць,
Дзе жыта ў полі каласіцца,
Дзе песня родная гучыць.

Прасторы тыя сэрцу мілы,
Туды душа мая імкнецца,
Мяне ў дзяцінстве там хрысцілі,
Там я заўжды душой і сэрцам.

Прыеду я на два дзянёчкі,
Матулю каб сваю абняць,
На сенавале летняй ночкай,
Як на пярыне, паляжаць.

Сустрэну з пеўнямі світанак
І басанож пайду на луг,
Там водар смачны і духмяны,
Аж заміраe сэрца стук.

І ні хвіліны не шкадую,
Што нарадзілася я тут,
Зямельку-матухну цалую,
Люблю бацькоўскі родны кут.

**Апанасевіч Юлія**

# РОДНАЯ МОВА

Я люблю беларускую мову
За яе меладычны напеў,
Быццам песня гучаць яе словы,
Хто не згодны, той не зразумеў

Усю пяшчоту ў ёй матчынай ласкі,
Дух натхнення ад роднай зямлі,
Мы з маленства ў песнях ды казках
Усю любоў да яе зберагли.

Яшчэ змалку, з дзіцячай калыскі,
Мы змаглі з малаком мацярынскім
Увабраць у сябе ўсю любоў
Тых пяшчотных матуліных слоў,

Што заўсёды яна напявала,
Немаўля да грудзей прыціскала,
Казкі баяла ды калыханку:
– Спі, дзіцятка, да самага ранку.

Хай табе сон салодкі прысніцца,
Як цурчыць ручаёк, заіскрыцца,
Пабяжыць ён на луг ды на поле,
Пагуляе ўдосталь на волі.

Спіць дзіцятка, у сне ўсміхнецца,
Бо ўжо адгукаюцца ў сэрцы
Усе матуліны родныя словы,
Голас ціхі такі і знаёмы.

Падрасце немаўля, пойдзе ў школу,
Будзе ведаць замежную мову,
Але ўсё ж не кране яна сэрца,
Роднай мовай занята ў ім месца.

Хай жыве беларускае слова,
Існуе да сканчання вякоў,
Ты шануй, берарус, сваю мову,
Гэта спадчына нашых дзядоў!

Апанасевіч Юлія